*8. Равикович, Д. А.* Социальные функции краеведческого музея / Д. А. Равикович // Музей и посетитель. – Вып. 3: вопросы социологического исследования в области музееведения / сост. В. А. Пронин. – М. : [б. и.], 1975. – С. 16–38. – Т. 65.

*9. Скрипкина, Л. И.* Актуальные проблемы музейного дела России на современном этапе / Л. И. Скрипкина // Новации в развитии музейного мира России в первое десятилетие XX века. – Новосибирск, 2011. – С. 8–17.

*10.* Социальные функции музея: споры о будущем (материалы дискуссии в отделе музееведения НИИ культуры) // Музееведение. На пути к музею XXI века. – М., 1989. – С. 186–204.

*11. Шляхтина, Л. М.* Современный музей: идеи и реалии / Л. М. Шляхтина // Вопросы музеологии. – 2011. – № 2. – С. 14–19.

*12. Шмит, Ф. И.* Музейное дело: Вопросы экспозиции / Ф. И. Шмит ; Гос. ин-т истории искусств. – Л. : Academia, гос. тип. изд-ва «Ленингр. правда», 1929. – 245, [1] с.

# ТЭМА «МАЛОЙ РАДЗІМЫ» Ў КАНТЭКСЦЕ ДУХОЎНА-МАРАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ СУЧАСНАЙ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ

***В. М. Белакурскі,***
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт, дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі гуманітарных навук Беларускаага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Дынамічныя змены, якія адбываюцца сёння ў жыцці беларускага грамадства, востра паставілі пытанне аб духоўна-маральных каштоўнасцях і іх месцы ў адукацыі і выхаванні сучаснай моладзі. Патокі гедэністычнай маралі з экранаў тэлевізараў і іншых СМІ, культ асалоды ў віртуальнай прасторы – ўсё гэта нярэдка аказвае даволі моцнае ўздзеянне на маладога чалавека. «Узоры» паводзін дэманструюць героі амерыканскіх баевікоў, крымінальныя аўтарытэты, скандальныя прадстаўнікі шоу-бізнесу, якія прапануюць маргінальнае разуменне сэнсу жыцця, а таксама спосабаў праяўлення адносін да свайго народа і краіны.

Адной з найважнейшых праблем духоўна-маральнага выхавання студэнцтва становіцца ў наш час праблема фарміравання і развіцця ў яго каштоўнасных адносін да сваёй «малой радзімы». З гэтым звязана не толькі разуменне неабходнасці захавання гісторыка-культурнай спадчыны сваёй бацькаўшчы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ны, але і адчуванне моладдзю асабістай адказнасці за вынікі сваіх намаганняў у дадзенай справе.

Паняцце «радзіма» сёння мае шмат сэнсаў, якія можна знайсці ў фальклорных крыніцах (прыказкі, прымаўкі і інш.), філасофскіх і палітычных тэкстах (вылучаюцца любоў да радзімы, патрыятызм і г. д.). Яшчэ ў антычнай Грэцыі нарадзілася ідэя самадастатковага горада-дзяржавы, поліснага калектыву, якая затым атрымала абгрунтаванне ў канцэпцыі касмапалітызму. Паняцце «касмапаліт» першапачаткова звязвалася з грамадзянінам грэчаскага поліса і несла важную сэнсавую нагрузку – гэта чалавек, адданы свайму гораду-полісу, сваёй радзіме.

Старажытны Рым упершыню прадэманстраваў бінарнасць вобраза радзімы. Выгнанне чалавека за межы яго айчыны становіцца ў Рыме выразным ідэнтыфікацыйным знакам, паколькі выгнаннік адначасова адлучаўся не толькі ад родных мясцін, але і ад агульнага праекта служэння радзіме.

Пачуццё прыналежнасці да краіны, родных мясцін (горада, вёскі), усведамленне агульнасці культуры і мовы, нацыянальная ідэнтычнасць і мноства іншых фактараў прыводзяць чалавека да падзелу паняцця «радзіма» на дзве часткі – «вялікая радзіма» і «малая радзіма». Асабліва інтымны і вельмі важны характар для чалавека першапачаткова набывае паняцце «малая радзіма». «Родина познаётся через семью: сначала родина для маленького человека – это родители, родные и близкие люди и их пределы – родной дом, родные стены, родное слово, родные места и т. д.» [1, с. 15].

«Малая радзіма» з'яўляецца суб'ектнай прасторай і характарызуецца «чалавечым вымярэннем». Формы такога вымярэння могуць быць рознымі – ад самасвядомасці чалавека да спосабаў яго жыццядзейнасці на канкрэтнай тэрыторыі. Пад «чалавечым вымярэннем» мы разумеем як адносіны асобы да канкрэтнай тэрыторыі, так і сукупнасць формаў чалавечай існасці ў межах пэўнага рэгіёну, жыццядзейнасць індывіда ў якім садзейнічае рэалізацыі яго асабістых здольнасцей і інтарэсаў, а таксама развіццю матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, якія спрыяюць дабрабыту людзей. Рэгіён выступае своеасаблівым фрагментам семіясферы – прасторы, якая запоўнена рознымі па прыродзе знакамі. У дадзеным кантэксце рэгіён уяўляе сабой аналаг «асобнага свету» (Ф. Брадэль) з асобным менталітэтам, вобразам мыслення, традыцыямі, светапоглядам і света-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адчуваннем [1]. Жыццёвы свет чалавека аказваецца ўпісаным у гэты прасторавы вобраз часткі свету. З аднаго боку, дадзены вобраз створаны чалавекам. З другога – ён сам актыўна фарміруе пагружанага ў яго чалавека (Ю. Лотман) [3].

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў як адзін з важных захавальнікаў і рэтранслятараў духоўнай культуры сёння мае значны патэнцыял для духоўна-маральнага выхавання студэнцкай моладзі, развіцця ў яе каштоўнасных адносін да культуры і гісторыі «малой радзімы». Апошняе цесна звязваецца з разуменнем маладым чалавекам сваёй адказнасці за вынікі асабістай жыццядзейнасці, асэнсаваннем стратэгічнай жыццёвай пазіцыі.

Працэс фарміравання каштоўнасных адносін да «малой радзімы» з'яўляецца, на наш погляд, эфектыўным менавіта тады, калі ў ім забяспечваецца належная сацыяльная матывацыя студэнцкай моладзі, умовы для рэалізацыі грамадска значных інтарэсаў, установак і памкненняў. У шырокім кантэксце гэта спрыяе больш актыўнаму далучэнню студэнцтва да гісторыі беларускага этнасу, традыцый і каштоўнасцей народнай творчасці, беларускай нацыянальнай культуры ў цэлым.

Каштоўнасныя адносіны да сваёй «малой радзімы» прадстаўляюць цэласнае інтэгратыўнае ўтварэнне ў структуры асобы. Сутнасць яго заключаецца ва ўсведамленні маладым чалавекам сацыяльнай значнасці культурных набыткаў яго продкаў, а таксама землякоў-сучаснікаў. У сваю чаргу, гэта выклікае пачуцці любві да родных мясцін, гонару і глыбокай павагі да працы і вопыту людзей мінулых пакаленняў, імкненне да беражлівага захавання і культурнага ўзбагачэння «малой радзімы».

Паказчыкамі каштоўнасных адносін студэнцкай моладзі да сваёй «малой радзімы» выступаюць: усведамленне неабходнасці захавання яе культурнай і гістарычнай спадчыны, любоў да зямлі, павага да сялянскай працы, імкненне зрабіць свой пачэсны ўнёсак у адраджэнне роднай вёскі, грамадска карысная дзейнасць у родных мясцінах.

Педагагічныя магчымасці фарміравання ў студэнтаў каштоўнасных адносін да «малой радзімы» вызначаюцца наступным: наяўнасцю асобасна значных суб'ектаў духоўна-маральнага выхавання і самаўдасканалення; знаходжаннем у сацыякультурным асяроддзі сучасных сялян-землякоў своеасаблівых эта-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лонаў грамадзянскасці, патрыятызму, любові да працы, якія задаюць мясцовай моладзі высокія стандарты адносін да бацькаўшчыны; стымуляваннем тых відаў студэнцкай дзейнасці, якія накіраваны на ўмацаванне этнакультурнай ідэнтычнасці асобы, засваенне духоўных традыцый родных мясцін; уключэннем студэнтаў у актыўную дзейнасць па захаванні і аднаўленні помнікаў культуры роднага краю.

Узбагачэнне ўнутранай культуры студэнта, яго эмпатычных здольнасцей выступаюць сёння ў ВНУ важнымі фактарамі выхавання грамадзяніна і патрыёта. Гэтай справе спрыяюць правядзенне фальклорных свят, конкурсаў народнай песні, турніраў знаўцаў беларускіх загадак, прыказак і прымавак, выстаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, сустрэч са знакамітымі землякамі і інш.

Дзейнасна-практычнае развіццё студэнтаў прадугледжвае ўключэнне іх у разнастайныя віды творчай, а таксама сацыяльна-значнай дзейнасці. Гэта не толькі яе мастацкія формы, але і валанцёрскі рух (дапамога ветэранам вайны і працы, дзейнасць па аднаўленні і захаванні помнікаў гісторыі і культуры), правядзенне конкурсаў дзелавых праектаў з іх будучай рэалізацыяй на тэрыторыі «малой радзімы» і інш.

Такім чынам, галоўнымі мэтавымі арыенцірамі выхавання ў студэнтаў любві і пачуцця адказнасці за лёс сваёй «малой радзімы», на наш погляд, выступаюць: у кагнітыўнай сферы – накіраванне асобы на духоўна-маральныя каштоўнасці, сярод якіх важнае месца належыць каштоўнасцям «малой радзімы»; у эмацыянальнай сферы – здольнасць да глыбокай эмацыянальнай рэакцыі пад час перажывання ўспрымаемых маральна-эстэтычных прадметаў і з'яў роднай бацькаўшчыны; у дзейнасна-практычнай сферы – актыўны, асэнсаваны ўдзел у творчай, сацыяльна-значнай дзейнасці па захаванні і развіцці гісторыка-культурнай спадчыны «малой радзімы».


1. *Бродель, Ф.* Грамматика цивилизаций / Ф. Бродель. – М. : Весь мир, 2008. – 552 с.

2. *Гребенок, Т. Н.* Образ Родины как общечеловеческая ценность // Философия, социология, политология. – Вестник Томского университета. –2007. – № 301. – С. 14–16.

3. *Лотман, Ю. М.* Семиосфера / Ю. М. Лотман. – СПб. : Искусство, 2000. – 704 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ